**МІНІСТЭРСТВА ФІНАНСАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

вул. Савецкая, 7, 220010, г. Мінск,
e-mail: minfin@minfin.gov.by
тэл. (017) 222 61 37, факс (017) 222 45 93
АКОДК 33220, УНП 100691903
р/р BY83AKBB36049000005730000000,
ААТ «ААБ Беларусбанк», БІК AKBB BY 2X

**МИНИСТЕРСТВО ФИНАНСОВ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

ул. Советская, 7, 220010, г. Минск,
e-mail: minfin@minfin.gov.by
тел. (017) 222 61 37, факс (017) 222 45 93
ОКОГУ 33220, УНП 100691903
р/с BY83AKBB36049000005730000000,
ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBB BY 2X

07.05.2020 № 1-1-22/46/КЛ-199
На № ______ от ______

Аб разглядзе звароту

Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь разгледзела ў межах кампетэнцыі калектыўны зварот, які паступіў з Апарату Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (ліст ад 22 красавіка 2020 г. № 15/5-З-226), і па пытанні страхавання жыцця або здароўя работнікаў аховы здароўя ад інфекцыі, выкліканай каронавірусам, паведамляе.

Работнікі аховы здароўя ў Рэспубліцы Беларусь, незалежна ад факту хваробы менавіта на каранавірус ці на другое захворванне, маюць права на выплаты ў сістэме дзяржаўнага сацыяльнага страхавання за кошт сродкаў дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва: забяспячэнне пенсіямі па ўзросце, інваліднасці, за выслугу гадоў, прафесійнымі пенсіямі, дапамогай па хваробе і часовай непрацаздольнасці, выплатамі, звязанымі з санаторна-курортным лячэннем і аздараўленнем, дапамогай на пахаванне (асобам, якія ўзялі на сябе арганізацыю пахавання памерлага).

Непрацаздольныя члены сям'і памерлага карміцеля, якія знаходзіліся на яго ўтрыманні, маюць права на пенсію з выпадку страты карміцеля.

У мэтах дадатковага матэрыяльнага стымулявання работнікаў аховы здароўя за працу ва ўмовах, звязаных з інфекцыямі, прыняты Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16.04.2020 г. № 131 «Аб матэрыяльным стымуляванні работнікаў аховы здароўя», які прадугледжвае ўстанаўленне значных надбавак да заробку названым работнікам (у памерах ад 300 да 4000 рублёў у залежнасці ад месца працы і катэгорый работнікаў).

Такім чынам, выплаты у сістэме дзяржаўнага сацыяльнага страхавання і павелічэнне ўзроўню заробку дазваляюць узмацніць узровень сацыяльнай абароны работнікаў аховы здароўя ў Рэспубліцы Беларусь.

Павелічэнне ўзроўня заробку работнікаў дазваляе ім на сваё меркаванне скарыстацца магчымасцямі добраахвотнага страхавання. Добраахвотнае страхаванне з'яўляеццца дадатковым сродкам сацыяльнай абароны работнікаў у выпадку шкоды, прычыненай жыццю ці здароўю грамадзяніна. Страхавымі арганізацыямі рэспублікі распрацаваны розныя праграмы страхавання, якія, у тым ліку, уключаюць страхаванне ад інфекцыі, выкліканай каронавірусам.

Дадаткова інфармуем, што на сённяшні дзень страхаванне ад інфекцыі, выкліканай каронавірусам, ажыццяўляецца:

Беларускім рэспубліканскім унітарным страхавым прадпрыемствам «Белдзяржстрах» па Правілах № 2 добраахвотнага страхавання ад небяспечных захворванняў;

Закрытым акцыянерным страхавым таварыствам «Белнефтестрах» па Правілах № 45 добраахвотнага страхавання ад небяспечных захворванняў і іх наступстваў;

Закрытым акцыянерным страхавым таварыствам «Прамтрансінвест» па Правілах № 10 добраахвотнага страхавання ад няшчасных выпадкаў;

Закрытым акцыянерным страхавым таварыствам «ТАСК» па Правілах № 43 добраахвотнага страхавання ад няшчасных выпадкаў і хвароб;

Сумесным беларуска-аўстрыйскім закрытым акцыянерным страхавым таварыствам «Купала» па Правілах № 24 ад няшчасных выпадкаў і хвароб.

Першы намеснік Міністра Ю.М.Селіверстаў

Кузьміч 309 41 60